## Патрэба выбару

Наш край стаіць напярэдадні разьвязкі сваей будучыны. І ў гэты мамэнт, калі кожын дзень набліжае нам тую разьвязку, кожын сын Беларусі і Літвы павінен сур'ёзна задумацца аб павіннасьці, якую ўскладае на яго Бацькаўшчына.

Павіннасьць гэта вымагае, каб усе мы забыліся аб усім тым, што можа быць прыемна ці непрыемна, карысна ці некарысна для тых або іншых паадзінокіх людзей. Шмат хто спаміж нас узгадоўваўся ад малых дзён ці то ў традыцыях колішняй Рэчы Паспалітай, ці ў духу Расейскага гасударства, ды з гэтай прычыны між намі ёсьць нямала людзей, каторыя тыя традыцыі стаўляюць вышэй за ўсё. Адных зь іх сэрца цягне да Варшавы, і яны хацелі б адбудовы колішняй Рэчы Паспалітай, а іншыя — дык проста прылучэньня нашых зямель да Польшчы. Для другіх прыемна казыча вуха слова „Масква“, дык яны хацелі б вярнуць наш Край пад Расею. І пры гэтым як адны, так і другія нават не задумываюцца над пытаньнем: а ці гэта будзе карысна для тэй Зямліцы, што іх узгадавала, што была і ёсьць для іх за родную матку?

Цяпер настаў час, калі прапускаць міма вушэй гэтага пытаньня нельга. Хто свае асабістыя сымпатыі ці антыпатыі будзе цяпер стаўляць вышэй, чым выразную карысьць Краю нашага і цьвёрдае жаданьне волі народу, той выракаецца сваей Бацькаўшчыны, той служыць ня роднай Зямлі, а чужым ідэалам, той адступнік і здраднік свайго Краю і многамільённых народных грамад, якія ждуць вызваленьня ад старой няволі і ня хочуць новай.

Няхай жа людзі, каторыя дагэтуль не знайшлі адказу на памянёнае пытаньне, зробяць самі з сабой „рахунак сумленьня“, няхай прыслухаюцца да біцьця свайго сэрца: што яно ім скажа. Выбар трэба зрабіць: за Бацькаўшчыну ці проці яе. І толькі пасьля гэтага выбару сапраўдныя сыны Беларуска–Літоўскага Краю здалеюць стануць на цьвёрды грунт, здалеюць знайсьці для сябе адпаведнае месца ў працы дзеля ясьнейшай будучыны Зямлі нашай, здалеюць споўніць як сьлед сваю павіннасьць перад Бацькаўшчынай.

## Добрыя весьці

Напярод можна было сказаць, што тэлеграма штакгольмскага зьезду „інародцаў“, пасланая яшчэ ў тым гаду прэзыдэнту Вільсану, вызаве ў Расеі двааякае ўражаньне: прызнаньне справядлівасьці ўсімі, у каго ёсьць сумленьне, і дзікія напасьці тых, хто ня хоча бачыць праўды, хто „ласку начальства“ стаўляе вышэй за ўсё на сьвеце. Так яно і выйшла. Калі ў Дзяржаўнай Думе паднялося пытаньне аб выключэньні з Думы польскага дэпутата Лямпіцкага, каторы разам з прадстаўнікамі беларусаў, літвінаў, украінцаў, жыдоў, армян, татараў, фінляндцаў і інш. падпісаў тэлеграму да Вільсана, літоўскі дэпутат Янушкевіч, між іншым, сказаў: „Лямпіцкага вінавацяць у тым, што ён падпісаў пэтыцыю да Вільсана. Але той дакумэнт падпісалі і прадстаўнікі іншых народаў, і я, як літоўскі дэпутат і прадстаўнік дэмакратыі, заяўляю, што ўсё, напісанае тамака, — праўда! Прадстаўнікі паняволеных народаў былі прымушаны зьвярнуцца да Вільсана затым, што Дума нацыянальнымі справамі не займаецца...“ Аб тым жа гаварыў і дэпутат Чхенкелі: „Што ж напісана ў пэтыцыі да Вільсана? Тое, што расейскае правіцельства нарушыла ўсе чалавечыя і боскія законы ў адносінах да цэлага раду нацый. Ды аб гэтым так часта чулі мы і з думскай трыбуны...“

Пэтыцыя да Вільсана не была ядыным выступленьнем паняволеных народаў. Тыя народы, каторыя ў часе вайны апынуліся за межамі „дасягаемасьці“ Расеі, сваей шырока разьвінуўшайся, нягледзячы на ваенны час, культурна–нацыянальнай работай выявілі найбольш рэзкі пратэст проці старой няволі, выказалі сваё права на жыцьцё і вольны быт, каторага царскае правіцельства пазбаўляла іх больш за сто гадоў. І гэты пратэст проці няволі ня толькі словам, але і творчым дзелам вызваў дужа цікавыя адгалоскі там — за расейскім